Да 40-годдзя Вялікай Перамогі

# СЦЯГАНОСЦЫ БАЯВОЙ СЛАВЫ

Г. КАРЗЕНКА,
кандыдат гістарычных навук.

Вялікая Айчынная вайна — суровы і гераічны перыяд у гісторыі краіны. Час, аддаляючы ад нас ваенныя гады, дае магчымасць больш глыбока і поўна ацаніць бяссмерце воінаў, якія прынялі бой у імя свабоды. Лепшыя прадстаўнікі шматнацыянальнай савецкай інтэлігенцыі, у тым ліку і навуковай, упісалі яркія старонкі ў гераічны летапіс барацьбы.

Д. П. ЖМУРОЎСКІ з аднолькавым поспехам выступае ў студэнцкай аўдыторыі, заводскім інтэрнаце, школьным музеі і калгасным клубе. Уважліва слухаюць юнакі і дзяўчаты расказы аб мужнасці і гераізме савецкіх людзей у гады вайны, бо перад імі ўдзельнік многіх баёў, адважны кулямётчык, які прайшоў тысячы кіламетраў цяжкіх франтавых дарог.

Нарадзіўся Д. П. Жмуроўскі ў в. Барысавічы Клімавіцкага раёна на Магілёўшчыне. З першых дзён гітлераўскага нашэсця ён пайшоў на фронт. Ваяваў храбра, паказваючы таварышам прыклад. Удзельнічаў у баях на Браншчыне, пад Белгарадам і Курскам, вызваляў гарады і сёлы братняй Украіны. Але асабліва праявіў сябе пры вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў малдаўскай зямлі. З групай смельчакоў Дзмітрый Жмуроўскі ў ліку першых фарсіраваў раку Прут. Яны захапілі плацдарм і ўтрымлівалі яго да падыходу асноўных сіл. Там разам з таварышамі ён адбіў 20 контратак праціўніка, быў паранены, але не пакінуў поля бою. Мужнаму кулямётчыку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У пасляваенны час былы франтавік настойліва вучыўся, атрымаў вышэйшую адукацыю, стаў выкладчыкам. Вось ужо амаль дваццаць гадоў Дзмі-



трый Пятровіч Жмуроўскі працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Ён — доктар гістарычных навук, прафесар, аўтар навуковых прац. Член партыі з 1946 г., ён перадае свой багаты жыццёвы вопыт маладым, вядзе вялікую грамадска-палітычную работу па выхаванню падрастаючага пакалення.

М. Я. ЗАЙЦАЎ у 1944 г. закончыў трэцюю Чкалаўскую ваенна-авіяцыйную школу пілотаў, дзе вывучаў вопыт вядомых паветраных асаў. Побач з ім у небе лятаў Пакрышкін. Было на каго раўняцца, з каго браць прыклад. Штурмавік



Зайцаў разбураў масты, знішчаў жывую сілу і тэхніку ворага.

Узлёт! Курс на Івана-Франкоўск. Нечакана неба разарвалася на мноства асколкаў — зенітны агонь фашыстаў. Кароткая сутычка з ворагам — і звяно штурмавікоў вырвалася з вогненнага кальца. Больш як 20 самалётаў на фашысцкім аэрадроме знішчылі ў той дзень штурмавікі. А калі Мікалай Зайцаў ляцеў назад, ён зрабіў круг над чыгуначнай станцыяй і скінуў астатнія бомбы.

Узлёт! Усходняя Сілезія, 1 мая 1945 г. Сёння штурмавікі паляцелі бамбіць пераправу цераз Одэр. У бой уступілі фашысцкія знішчальнікі. Вечарам М. Зайцаў пісаў у рапарце: «Падавілі зенітную батарэю, сарвалі пераправу і збілі 4 нямецкія знішчальнікі».

У цяжкіх умовах вайны закончылася фарміраванне характару Мікалая Якаўлевіча як чалавека і афіцэра Чырвонай Арміі. У чацвёртым томе Беларускай Савецкай Энцыклапедыі чытаем: «У Айчынную вайну ваяваў на 1, 4 Украінскіх франтах — лётчык-штурмавік, камандзір звяна. Зрабіў 185 баявых вылетаў, правёў 15 паветраных баёў, збіў 2 самалёты, знішчыў каля 20 танкаў, 80 аўтамашын, 43 гарматы і мінамёты, 20 вагонаў»[1]. У 22 гады за мужнасць і гераізм Мікалаю Зайцаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Акрамя айчынных узнагарод, ён атрымаў чэхаславацкі медаль «За храбрасць».

Палкоўнік запасу Мікалай Якаўлевіч Зайцаў — кандыдат філасофскіх навук, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ імя У. І. Леніна.



Я. У. КЛУМАЎ быў удзельнікам Мінскага камуністычнага падполля. Нарадзіўся ён у снежні 1876 г. у Маскве ў сям'і адваката. Тут закончыў медыцынскі факультэт універсітэта. З 1914 г. працаваў земскім урачом у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні. Пасля рэвалюцыі загадваў гінекалагічным і хірургічным аддзяленнямі 1-й Мінскай гарадской бальніцы, абараніў дысертацыю. Яму было прысвоена вучонае званне — прафесар.

У падполлі Яўген Уладзіміравіч быў вядомы пад імем «Самарын» і ўзначальваў групу медыцынскіх работнікаў. Знешне замкнуўшыся ў сценах бальніцы, ён ператварыў яе ў месца, дзе вяртаў да жыцця партызан і падпольшчыкаў, наладжваў сустрэчы з сувязнымі.

Сваёй бясстрашнасцю і нястомнай дзейнасцю Клумаў заваяваў любоў і павагу партызан, удзельнікаў падпольнай барацьбы. У данясенні з Мінска ў верасні 1943 г. гаворыцца: «Самарын. Палымяны барацьбіт з фашысцкімі захопнікамі. Уключыўся ў актыўную работу з пачатку 1942 г. Вельмі многа медыкаментаў перадаў у распараджэнне народных мсціўцаў. Праз тав. Самарына можна было дастаць самыя дэфіцытныя і самыя важныя медыкаменты»[2]. Ён хаваў у шпіталях і бальніцах савецкіх людзей, якім пагражала небяспека, лячыў хворых, рабіў ім аперацыі.

Па ініцыятыве Я. У. Клумава ў клініку дастаўлялі партызанскія лістоўкі, савецкія газеты, зводкі Саўінфармбюро. У гэтай высакароднай патрыятычнай дзейнасці яму актыўна памагалі прафесары І. А. Вятохін і М. А. Прыляжаеў. Восенню 1943 г. прафесар быў арыштаваны гітлераўцамі і ў сакавіку 1944 г. разам з жонкай закатаваны. Пасмяротна ў 1965 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем у Мінску названы вуліца, завулак, сярэдняя школа № 67 і 3-я клінічная бальніца, на будынку якой устаноўлена мемарыяльная дошка.



Ф. А. МАЛЫШАЎ — сын селяніна з палескай вёскі ў Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці. Ён прайшоў шлях, тыповы для маладога чалавека 30-х гадоў: школа — рабфак — інстытут.

Вайна застала выпускніка торфамеліярацыйнага факультэта Мінскага політэхнічнага інстытута на віцебскім торфапрадпрыемстве «20 год Кастрычніка». Каб прадпрыемства не магло працаваць на фашыстаў, інжынер Малышаў зняў з машын найбольш важныя дэталі і вузлы. Потым — арышт, допыты, лагер, адкуль ён уцёк. Дабраўшыся ў родныя мясціны, уступіў у партызанскі атрад. Быў сувязным, падрыўніком атрада Міхайлоўскага 125-й брыгады Палескага злучэння. На яго асабістым рахунку 18 узарваных варожых эшалонаў. Гераічны подзвіг Ф. А. Малышава, актыўнага ўдзельніка «рэйкавай вайны», адзначаны ордэнам Леніна і Залатой Зоркай Героя.

Пасля вайны Фёдар Аляксеевіч вывучаў праблемы здабычы і рацыянальнага выкарыстання торфу, акультурвання выпрацаваных тарфянікаў для далейшага выкарыстання ў сельскай гаспадарцы. 34 гады Ф. А. Малышаў працуе ў Інстытуце торфу АН БССР.



А. А. ФІЛІМОНАЎ сустрэў вясну 1945 г. у Германіі. Пад знішчальнымі ўдарамі савецкіх войск вораг ярасна супраціўляўся. Танкавая рота Аляксандра Андрэевіча пад Берлінам перагарадзіла шлях буйным сілам праціўніка, адбіла 10 атак, знішчыла 12 танкаў і самаходных гармат, 11 палявых гармат, 20 аўтамашын, 500 гітлераўцаў.

За ратныя подзвігі, асабістую храбрасць і мужнасць, праяўленыя ў берлінскай аперацыі, яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Нават калі над рэйхстагам узняўся чырвоны флаг, вайна для А. Філімонава не скончылася. Выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак, танкавая армія генерала Д. Д. Лялюшэнкі, у састаў якой уваходзіла танкавая рота Філімонава, прыняла ўдзел у вызваленні Чэхаславакіі.

Пасля вайны Аляксандр Андрэевіч працягваў вучобу ва універсітэце, паспяхова закончыў аспірантуру і абараніў кандыдацкую дысертацыю па гісторыі КПСС. Доўгі час працаваў выкладчыкам у БДУ імя Леніна і Гомельскім педагагічным інстытуце, абараніў доктарскую дысертацыю.

Цяпер прафесар Аляксандр Андрэевіч Філімонаў — аўтар шэрагу манаграфій і абагульняючых прац — займае пасаду намесніка дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК Кампартыі Беларусі.

Творчая дзейнасць, подзвігі беларускіх вучоных — слаўныя старонкі летапісу народнай славы, наш гонар.

---

[1] БелСЭ. Мінск, 1971, т. 4, с. 472.
[2] Коммунист Белоруссии, 1960, № 6, с. 87.